# ВЫКАРЫСТАННЕ ТЭХНАЛОГІІ СЭНСАВАГА ЧЫТАННЯ ДЛЯ ФАРМІРАВАННЯ ЧЫТАЦКАЙ ГРАМАТНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**Каротчанка Надзея Аляксандраўна,**
метадыст ДУ "Шумілінскі раённы вучэбна-метадычны кабінет"

***Чытанне – гэта акт цывілізацыі, ён бярэ бясплатную сыравіну розуму і будуе замкі магчымасцей.***

***Бэн Окры***

*У артыкуле разглядаюцца пытанні неабходнасці фарміравання правільнага тыпу чытацкай граматнасці як важнейшай кампетэнцыі сучаснай асобы. Апісваюцца эфектыўныя метадычныя прыёмы з тэкстам, накіраваныя на прадуктыўны працэс вучэбнай дзейнасці.*

**Уводзіны.** Кім бы ні стаў у будучым навучэнец, ён заўсёды павінен быць чытачом, павінен умець не толькі засвойваць змест, але і знаходзіць неабходную інфармацыю, асэнсоўваючы і інтэрпрэтуючы яе. Непаспяховасць у вучэбнай дзейнасці ў многім звязана з няўменнем разумець прачытанае. Таму ад умення чытаць, вылучаць неабходную інфармацыю залежыць поспех у вучэбнай дзейнасці і жаданне вучыцца. Чытанне – універсальная тэхніка атрымання ведаў у сучасным грамадстве, а разуменне тэксту – гэта пазнавальная дзейнасць па ўстанаўленні сэнсаў на аснове чытацкага вопыту. Асаблівае месца сярод метапрадметных універсальных вучэбных дзеянняў займаюць чытанне і работа з інфармацыяй. Уменне проста чытаць недастатковае. Гэта трэба рабіць правільна, прадумана, прадуктыўна.

Праблема фарміравання чытацкай граматнасці навучэнцаў існавала заўсёды, але ў апошні час у свеце айчынных і міжнародных даследаванняў яна набыла новае гучанне. Сучасныя дзеці менш чытаюць кнігі, але ў цэлым значна больш: паведамленне ў месенджарах, абмеркаванне на форуме і каментарыі ў сацыяльных сетках, нават пад фотаздымкамі ў Instagram ёсць тэксты. Праблема ў іншым: кантэнт у інтэрнэце на сённяшні дзень крайне прымітыўны. І таму выклікае цяжкасць разуменне складаных, мастацка дасканалых, а тым больш навуковых тэкстаў, уменне пераказваць, структурыраваць іх. Іншымі словамі, назіраецца дэградацыя навыкаў работы навучэнцаў са складанай інфармацыяй.

**Асноўная частка.** Сусветны эканамічны форум абазначыў шаснаццаць відаў ведаў і ўменняў паспяховага чалавека ў дваццаць першым стагоддзі. Гэта навыкі работы ў камандзе, лідарскія якасці, ініцыятыўнасць, IT-кампетэнтнасць, фінансавая і грамадзянская граматнасць. Развіццё гэтых якасцей становіцца задачай сучаснага настаўніка. Перадумовай развіцця кампетэнтнасці "адукацыя праз усё жыццё" з'яўляецца наяўнасць пэўнага ўзроўню чытацкай граматнасці. Сёння задача школы заключаецца не толькі ў тым, каб навучыць дзіця вучыцца, але і сфарміраваць фукцыянальна граматную асобу, здольную арыентавацца ў навакольным свеце і дзейнічаць у адпаведнасці з грамадскімі нормамі, запытамі, інтарэсамі. Граматнасць чытання – адна з важнейшых кампетэнцый чалавека і аснова ўмення вучыцца. Чытацкая граматнасць – гэта не сінонім начытанасці або добрай тэхнікі чытання, а здольнасці навучэнцаў разумець, асэнсоўваць пісьмовыя тэксты, аналізаваць, выкарыстоўваць іх змест для развіцця ведаў і магчымасцей для актыўнага ўдзелу ў жыцці грамадства. Самастойная праца школьніка з тэкстамі, дадатковай літаратурай – крыніца паспяховага навучання і паказчык асобаснага развіцця.

На ўроках роднай мовы і літаратуры настаўнік павінен увасабляць некалькі прыярэтэтных накірункаў, адным з якіх з'яўляецца фарміраванне навыкаў сэнсавага чытання. Праблема разумення тэксту патрабуе для свайго вырашэння сучасных падыходаў. Традыцыйны метад не задавальняе сучасным патрабаванням. Зараз дзеці чытаюць павярхова, адчуваюць цяжкасці ва ўспрыманні і ў запамінанні прачытанага.

Працэс, які мы разглядаем, складаецца з трох элементаў: успрыманне тэксту, раскрыццё яго зместу і сэнсу; тлумачэнне знойдзенай інфармацыі; набыццё новых ведаў у выніку разважанняў. Сэнсавае чытанне накіравана на разуменне чытачом сэнсавага зместу тэксту, на ўменне знаходзіць пэўныя звесткі з розных тэкстаў, працаваць з мастацкімі і немастацкімі суцэльнымі і несуцэльнымі тэкстамі, ацэньваць атрыманую інфармацыю. Сэнсавае чытанне – гэта здольнасць чалавека да ўсведамлення пісьмовых тэкстаў і рэфлексіі на іх, да выкарыстання іх зместу для дасягнення ўласных мэт, развіцця ведаў і магчымасцей. Навучэнцы павінны авалодаць навыкамі разумення тэксту, аналізаваць, параўноўваць, відазмяняць, ствараць уласныя тэксты пад свае задачы. Дадзенае паняцце як універсальнае вучэбнае дзеянне ўключае ў сябе: асэнсаванне мэты чытання, вылучэнне неабходнай інфармацыі, вызначэнне асноўнай і другаснай інфармацыі, успрыманне тэкстаў розных стыляў.

Сэнсавае чытанне з'яўляецца метапрадметным вынікам засваення адукацыйнай праграмы агульнай сярэдняй адукацыі. Валоданне навыкамі сэнсавага чытання садзейнічае развіццю вуснай мовы, як наступства – пісьмовай, гэта значыць яно з'яўляецца сродкам фарміравання чытацкай граматнасці. Для таго, каб дадзены від чытання быў сэнсавым, навучэнцам неабходна складаць сваю сістэму вобразаў, усведамляць інфармацыю, ажыццяўляць пазнавальную дзейнасць. Метады, якія садзейнічаюць развіццю навыка сэнсавага чытання, наступныя: праблемна-пошукавыя заданні, пытальна-адказнае абагульненне, дыскусія, абмеркаванне, мадэляванне сітуацый, малюнак.

Як настаўнік традыцыйна працуе з новым тэкстам на ўроку? Спачатку рыхтуе навучэнцаў да ўспрыняцця тэксту: расказвае пра пісьменніка, засяроджвае ўвагу на тэматыцы яго твораў, тлумачыць значэнне незразумелых, з яго пункту погляду, слоў, потым сам выразна чытае тэкст услых, і толькі пасля гэтага навучэнцы пачынаюць самастойна працаваць з тэкстам. Па сутнасці, яны не атрымліваюць адказу на галоўнае пытанне: што ж азначае ўмець чытаць тэкст? Для адпрацоўкі навыкаў сэнсавага чытання выдзяляюцца наступныя этапы работы з тэкстам.

I. Работа з тэкстам да чытання. Спачатку навучэнцы выказваюць меркаванні па назве, ілюстрацыі, пра што пойдзе гаворка ў дадзеным тэксце для таго, каб пасля гэтага задаць аўтару пытанне, прадугледзець, знайсці ў тэксце адказ, праверыць сябе. Работа з тэкстам да чытання накіравана на развіццё антыцыпацыі (прадказанне зместу тэксту па загалоўку, ілюстрацыі, групе ключавых слоў). Чытаючы прозвішча аўтара, загаловак твора, разглядаючы ілюстрацыі, вучні выказваюць свае меркаванні пра герояў, тэму, змест твора. Чытаюць ключавыя словы, якія настаўнік загадзя вычленіў з тэксту, зноў удакладняюць свае прапановы пра герояў, тэму, змест. Вынік этапу – знаёмства не толькі з фактычнай інфармацыяй, але і ўласная яе інтэрпрэтацыя.

Эфектыўныя прыёмы, якія можна выкарыстаць пры фарміраванні навыкаў сэнсавага чытання ў час прадтэкставай дзейнасці, наступныя.

Прыём *"Прагноз па назве":* навучэнцам прапануецца падумаць, пра што пойдзе гутарка ў аповесці Янкі Брыля "Сірочы хлеб", апавяданні Вячаслава Адамчыка "Салодкія яблыкі".

Прыём *"Кошык ідэй"*. Перад чытаннем апавядання Анатоля Кудраўца "Цітаўкі" выказваюцца свае меркаванні-прагнозы наконт таго, пра што будзе апавяданне, хто можа быць галоўным героем, якая падзея будзе апісана.

Прыём *"Асацыятыўны рад"* заснаваны на падборы асацыяцый па вывучаемым творы.

Прыём *"Слоўнік слоў"* прадугледжвае выбар з прапанаванай групы слоў тых, якія могуць быць звязаны з тэкстам (Міхась Лынькоў "Васількі" – бусел, трава, малюнак, сінія васількі, вайна, хлопчыкі, кветкі, памяць, вораг, маці, радасць).

II. Работа з тэкстам у час чытання. Настаўнік выяўляе першапачатковае ўспрыманне тэксту. Пасля першаснага прачытання, як правіла, ставяцца пытанні на выяўленне настрою, уражанняў: Які настрой узнік пасля прачытання твора? Якія пачуцці? Што спадабалася? Чым хацелі бы падзяліцца? Прасочваюцца супадзенні першапачатковых уяўленняў вучняў са зместам, эмацыянальнай афарбоўкай прачытанага. Паўторнае знаёмства з творам павінна быць абавязкова ўслых па абзацах, мікратэмах з каментарыямі па ходзе чытання. Настаўнік задае пытанні на разуменне, вяртае да тэксту, у якім пацвярджаюцца тыя або іншыя назіранні. Гэта дазваляе праверыць меркаванні навучэнцаў і праз тэкст арганізаваць "дыялог з аўтарам". Аналіз кантэнту ўключае наступныя дыдактычныя прыёмы: чытанне з каментарыямі, дыялог-дыскусію пра прачытанае, выдзяленне ключавых слоў, сказаў, абзацаў, пастаноўку ўдакладняльных пытанняў да кожнай сэнсавай часткі, выразнае чытанне частак твора.

III. Работа з тэкстам пасля чытання. Пранікненне ў падтэкст шляхам калектыўнага абмеркавання прачытанага, вызначаецца галоўная ідэя твора. Свае адказы вучні пацвярджаюць словамі з тэксту, звяртаюцца да другіх твораў, аналагічным сітуацыям з жыцця. Прадуктыўнымі прыёмамі працы з тэкстам на ўроках літаратуры па развіцці чытацкіх уменняў могуць быць наступныя:

*"Толькі адна хвіліна":* за адну хвіліну неабходна раскрыць галоўную думку твора.

*“Лагічны ланцужок”:* прадставіць падзеі з твора ў лагічнай паслядоўнасці (М. Лупсякоў “Мэры Кэт”: 1. У школу, на танцы. 2. У класе – навічок. 3. Крыўда. 4. Я чую. 5. На рэчцы. 6. На лёдзе ўдваіх).

*“Чыстая дошка”.* На дошцы запісваюцца пытанні да твора, самастойна складзеныя навучэнцамі. Пытанне абмеркавана, яно сціраецца з дошкі. Чыстая дошка – усе пытанні вырашаны ў сумесным пошуку.

*“Мім-тэатр”:* па жэстах, міміцы адгадаць героя. Арганізуецца работа з загалоўкам тэксту, абмяркоўваецца яго сутнасць. Мэтазгодна папрацаваць з ілюстрацыямі да твора, каб суаднесці задумку мастака з чытацкім уяўленнем. На дадзеным этапе прадуктыўнымі будуць творчыя віды дзейнасці (міні-сачыненне, пісьмовы адказ герою, характарыстыка, эсэ).

Галоўная перавага сэнсавага чытання – актыўная пазіцыя навучэнца да зместу тэксту. Для яго вучэбны тэкст – сродак для ажыццяўлення розных працэсаў мыслення. Вынікам такой работы з’яўляецца вучнёўскі прадукт у выглядзе выкананых заданняў, складзеных уласных разважанняў.

**Заключэнне.** Такім чынам, метады і прыёмы сэнсавага чытання сёння вельмі актуальныя. Яны адпавядаюць асноўным патрабаванням мадэрнізацыі навучання – фарміраванню прадметных, асобасных і метапрадметных адукацыйных вынікаў. Галоўнай умовай арганізацыі навучання выступае сумесная вучэбная дзейнасць.

### Літаратура

1. Губаева, И.С. Основы смыслового чтения [Электронный ресурс] / И.С. Губаева. – Режим доступа: urok.1sept.ru›articles/698920. – Дата доступа: 24.08.2023.

2. Смысловое чтение как основа формирования и развития навыков функциональной грамотности: метод. пособие / сост.: Т.В. Самсонова, Т.В. Шатина, О.А. Приказчикова, А.А. Парамонова. – Саранск: ЦНППМ «Педагог 13.ру», 2022. – 32 с.

3. Фисенко, Т.И. Развитие навыка смыслового чтения при работе с различными текстами на уроках [Электронный ресурс] / Т.И. Фисенко. – Режим доступа: http:// www.bibliofond/ru/view/aspx? Id=565413. – Дата доступа: 25.08.2023.